

Download

Вясна | Брэст
Forwarded from Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Жыхару Баранавічаў прысудзілі 2 гады «хіміі» за сарваны дзяржаўны сцяг

У судзе Баранавічскага раёна і г. Баранавічы 17 лістапада агучылі прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да **Аляксандра Гаўрыльчыка**, якога вінавацілі ў здзеку над дзяржаўнымі сімваламі (арт. 370 Крымінальнага кодэкса).

Вечарам 16 верасня 2021 года **Аляксандр Гаўрыльчык** дацягнуўся да дрэўка сцяга, замацаванага на магазіне “Южанка” ў г. Баранавічы, пасля чаго, сарваў сцяг і пашкодзіў дрэўка, разламаўшы яго на дзве часткі, пранёс сцяг да месца свайго жыхарства.

Аляксандр Гаўрыльчык прызнаў віну цалкам. У судзе патлумачыў, што ў той дзень выпіваў з сябраў, пасля мужчыны падыйшлі да банкамату каля магазіну “Южанка”, знялі грошы, а калі абвінавачаны вяртаўся дадому – пабачыў сцяг.

“Мы з сынам часта ходзім на футбол, дзе ёсць аматары са сцягамі. Сын спытаў у мяне, дзе наш сцяг. І я нічога больш не прыдумаў, як сарваць сцяг. Сарваў сцяг і прынёс дадому”, - распавёў Аляксандр Гаўрыльчык.

У судзе апыталі сведку – сябра абвінавачанага, а сведкі – супрацоўнікі магазіна “Южанка” – у суд не з’явіліся.

Падчас спрэчак бакоў пракурорка **Вераніка Палулех** прасіла суд прызнаць Аляксандра Гаўрыльчыка вінаватым і па арт. 370 КК прызначыць яму два гады “хіміі”.

Абвінавачаны сказаў, што аступіўся, але “кожны чалавек мае права на другі шанец, каб загладзіць свае памылкі”.

“Я ні ў якім выпадку не хацеў абразіць сваю краіну або здзеквацца над сцягам. <...> Хачу папрасіць прыняць да ўвагі змякчальны фактар маёй віны – цяжкую хваробу сына, якога прыходзіцца вазіць у Мінск кожны месяц”, – сказаў Гаўрыльчык.

У выніку суддзя **Сяргей Данільчык** прызначыў Аляксандру Гаўрыльчыку **пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем** ва ўстанову адкрытага тыпу **тэрмінам на два гады**.
t.me/viasna_brest/1686
574 viewsNov 18, 2021 at 10:16

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy